Віцебск .info

№2 7/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**У берасцейскім штабе Аляксандра Мілінкевіча знойдзена прыстасаваньне для сакрэтнага праслухоўваньня**. 6 сакавіка кіраўнік штабу Зьміцер Шыманскі атрымаў ананімны ліст па электроннай пошце ад людзей, якія назваліся супрацоўнікамі КДБ. Аўтары ліста паведамілі, што супраць прыхільнікаў Мілінкевіча рыхтуецца правакацыя, што ў памяшканьне могуць падкінуць зброю і што яно праслухоўваецца, а таксама назвалі месца ўстаноўкі мініятурнага радыётэлефона. Прыстасаваньне для праслухоўваньня сапраўды было знойдзена.

# Цытаты

**“Мы спыняем такія выпадкі, калі неабгрунтавана затрымліваюць прадукцыю, за якую Цэнтравыбаркам заплаціў грошы**. Атрымліваецца абсурд, што ЦВК грошы плаціць, а дзяржаўныя органы потым затрымліваюць гэтую прадукцыю. Гэта, канечне, непарадак”.
*Сакратар Цэнтравыбаркаму* ***Мікалай Лазавік***

# Людзі

**У Магілёве міліцыя затрымала палітыка Анатоля Лябедзьку.** Кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька прыехаў у Магілёў для правядзеньня сустрэчаў з выбаршчыкамі як давераная асоба Аляксандра Мілінкевіча. Пасьля сустрэчы з выбарцамі на плошчы каля дыягнастычнага цэнтру да Анатоля Лябедзькі падышлі супрацоўнікі міліцыі і папрасілі яго прайсьці ў пастарунак. Ён адмовіўся. Тады яго сілай даставілі ў Ленінскі РАУС.

# Факты

**У дзяржаўных установах Віцебску адмаўляюцца разьмяшчаць агітацыйныя матэрыялы пра Мілінкевіча.** Кожны з трох райвыканкамаў Віцебска вызначыў я месцы, дзе мусіць вісець агітацыя да прэзыдэнцкіх выбараў. Але старшыня Кастрычніцкага райвыканкаму аддаў адмысловае распараджэньне не разьмяшчаць матэрыялы пра Мілінкевіча, бо на ўлётках і буклетах надрукаваныя словы “новы прэзыдэнт”.

# Абвесткі

**У інтэрнэце пачынаецца кампанія ў падтрымку Аляксандра Мілінкевіча**
Акцыя мае на мэце стварэньне альтэрнатывы афіцыйным канцэртам “За Беларусь”. Арганізатары заклікаюць музыкаў, кампазытараў і сьпевакоў дасылаць на інтэрнэт-сайт Аляксандра Мілінкевіча milinkevich.org паведамленьне пра сябе, а таксама музычную кампазыцыю альбо песьню.